Саітава В. І.,
Страмужэўская Т. В.

# ПАМЯТНЫЯ КНІЖКІ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ: АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

У Расійскай Імперыі ў складзе мясцовых органаў дзейнічалі губернскія статыстычныя камітэты, якія пачалі стварацца ў 1834 г. разам з арганізацыяй Статыстычнага аддзялення пры Савеце Міністэрства ўнутраных спраў (МУС) [3]. Станаўленне статыстыкі было выклікана патрэбамі дзяржаўнага ўпраўлення, у тым ліку на рэгіянальным узроўні. Згодна з «Правилами о Статистическом отделении при Совете Министерства внутренних дел» (20.XII.1834) яго мэтай было складанне дакладных апісанняў стану ўсіх аб'ектаў (частак), падпарадкаваных міністэрству, «при производстве статистических работ чиновники должны были всегда начинать историческим обозрением прежнего состояния описываемой им части для сравнения его с настоящим». У абавязкі губернскіх статыстычных камітэтаў (далей статкамітэты) уваходзіў збор звестак, іх упарадкаванне і адлюстраванне ў табелях па формах Статыстычнага аддзялення, а таксама складанне на падставе атрыманых звестак дакладных агульных апісанняў губерняў ці некаторых галін гаспадаркі, прамысловасці і гандлю.

У 1842 г. МУС істотна пашырыла кола статыстычнай справаздачнасці губерняў, што спрыяла ўсебаковаму прадстаўленню фактаграфічных звестак і аналітычных матэрыялаў аб мясцовай эканоміцы, складзе насельніцтва, розных галінах тагачаснай народнай гаспадаркі, напрамках дзейнасці рэгіёнаў.

У сярэдзіне XIX ст. адбылася рэарганізацыя Статыстычнага аддзялення пры Савеце МУС. На яго аснове з далучэннем Часовага камітэта для «люстрацыи» памешчыцкіх маёнткаў Заходняга краю быў створаны Цэнтральны статыстычны камітэт (1858) [4]. Гэтаму органу падпарадкоўваліся ўсе губернскія статкамітэты, якім накіроўваліся «надлежащие наставления и руководства» па пытаннях атрымання неабходных звестак и праверкі статыстычных работ.

Статыстычная праца як асноўны кірунак дзейнасці губернскіх статкамітэтаў забяспечвала сістэматычнае назапашванне ўпарадкаваных даных аб развіцці рэгіёнаў. Неабходна звярнуць увагу і на тое, што з пачатку існавання гэтых установаў перад імі таксама ставіліся задачы выяўлення і апісання гістарычных помнікаў, што паўплывала на ўзнікненне, а ў далейшым і актывізацыю гістарычна-краязнаўчых даследаванняў мясцовасцей. Трэба сказаць, што ў XIX ст. невыразна акрэсленымі былі аб'ём паняцця «статыстыка» і пералік яе аб'ектаў, сярод якіх – і выяўленне фактаў мінулага. Неаднаразова ў дакументах, што рэгламентавалі дзейнасць губернскіх статкамітэтаў, падкрэслівалася важкасць выяўлення і апісання помнікаў старажытнасці рознага паходжання. Паказальна, што ў Палажэнні аб губернскіх і абласных статыстычных камітэтах (1860) разам з пералікам іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абавязкаў, складу быў вызначаны як кірунак дзейнасці збор звестак аб гістарычных помніках. Гэты дакумент паставіў перад статкамітэтамі задачу стварэння навуковых прац «всякого рода, имеющих целью исследование губернии в разных отношениях»*. Цыркуляр Міністэрства ўнутраных спраў № 397 (1861) таксама абавязваў губернскія статкамітэты збіраць звесткі аб гістарычных помніках і публікаваць сабраны матэрыял па гісторыі губерні. Гэта значна актывізавала адпаведную навукова-даследчую і выдавецкую дзейнасць. Цыркуляр Міністэрства ўнутраных спраў № 31 (1894) даручаў статкамітэтам весці назіранні за помнікамі даўніны, прадметамі, археалагічнымі аб'ектамі. Такім чынам, нават інстытуцыянальна была прадвызначана роля губернскіх статкамітэтаў як рэгіянальных цэнтраў у краязнаўчым руху, што і адбылося ў рэчаіснасці.

У склад губернскіх статкамітэтаў уваходзілі губернатары, віцэ-губернатары, абавязковыя («непременныя»), правадзейныя, ганаровыя члены. Фактычна ж кіраўніцтва і асноўная практычная праца здзяйсняліся асобнымі штатнымі супрацоўнікамі – сакратарамі. Некаторыя з іх выдатна паказалі сябе ў краязнаўчай дзейнасці. Станоўчую ролю ў гэтым кірунку адыгралі таксама мясцовыя чыноўнікі, настаўнікі і іншыя асобы, краязнаўцы па прызванні, якія актыўна ўключыліся ў вывучэнне гістарычнага мінулага свайго краю, падрыхтавалі каштоўныя апісанні і даследаванні гарадоў і мястэчак, манастыроў, замкаў і іншых аб'ектаў, узнялі нямала хвалюючых пытанняў мінулага і сучаснасці.

У ліку першых у Расіі ў 1834 г. узнік Мінскі губернскі статыстычны камітэт. У 1835 г. былі адкрыты статкамітэты ў Віцебску, Вільні, Гродне, Магілёве. Для іх былі характэрнымі той жа склад і асноўныя кірункі дзейнасці. Па персанальным складзе яны былі даволі шматлікімі: акрамя губернатараў і віцэ-губернатараў у іх з розным статусам уваходзілі прадвадзіцелі павятовага дваранства, прадстаўнікі царквы розных канфесій, чыноўнікі шэрагу ведамстваў, настаўнікі і інш. Але ключавая роля належала штатнаму персаналу, які прадстаўлялі сакратары статкамітэтаў: у Віленскім губернскім статыстычным камітэце працавалі А.Г. Кіркор**, П.І. Нябольсін, Шверубовіч, А.П. Чырыкаў, Г.А. Хатунцаў, Н.Ф. Дабравольскі, Д.Л. Навіцкі, Ю.В. Тацішчаў, А.П. фон Вонгасу; Віцебскім губернскім статыстычным камітэце – А.М. Семянтоўскі, А.П. Сапуноў; Гродзенскім губернскім статыстычным камітэце – Лапушынскі, П.А. Арлоў, П.М. Дзікаў, Э.А. Штрытэр, Д.В. Івашынцаў; Магілёўскім губернскім статкамітэце – Н.Я. Дубенскі, Біпен, А.А. Пацехін, А.М. Горбаў, І.Ф. Невінскі, Г.Г. Данілаў, М.Н. Харашавін, Г.П. Пажараў, І.І. Марчанка; Мінскім губернскім статыстычным камітэце – І.І. Здановіч, У.А. Бенземан, П.В. Занцэвіч, І.П. Галавачоў, А.П. Смародскі, В.І. Турцэвіч, А.Н. Замяцін, В.С. Ярмаловіч і інш. Некаторыя з гэтых чыноўнікаў, дзякуючы працы ў губернскіх статкамітэтах, глыбокай зацікаўленасці ў вывучэнні сваёй мясцовасці, навуковым здольнасцям, увайшлі ў гісторыю як выдатныя краязнаўцы. Гэта перш за ўсё Адам Карлавіч Кіркор, Аляксандр Максімавіч Семянтоўскі, Аляксей Парфёнавіч Сапуноў, Аляксандр Паўлавіч Смародскі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Згодна з афіцыйна акрэсленым кірункам дзейнасці статкамітэты арганізавалі паступленне і апрацоўку разнастайных эканамічных паказчыкаў, даведачных матэрыялаў (адрасоў устаноў, арганізацый, прадпрыемстваў, вайсковых частак, пражывання асоб, якія ўпамінаюцца, і інш.), палажэнняў, інструкцый, правілаў і іншых афіцыйных дакументаў мясцовых улад, якія рэгламентавалі асобныя напрамкі сацыяльна-эканамічнай дзейнасці, напрыклад акцызную справу ў Мінскай губерні («Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1890 год»). Значная ўвага надавалася і працы па вывучэнні гістарычнага мінулага, выяўленні і апісанні помнікаў даўніны.

У абавязкі губернскіх статкамітэтаў уваходзіла выкананне запытаў па гістарычна-краязнаўчай тэматыцы, якія паступалі з розных устаноў. Напрыклад, Гродзенскім губернскім статыстычным камітэтам па даручэнні Цэнтральнага статыстычнага камітэта збіраліся матэрыялы аб курганах і гарадзішчах па праграме Д.Я. Самаквасава. У 1880-х гг. для Акадэміі мастацтваў вёўся пошук звестак аб помніках старажытнага мастацтва, а па запыце Маскоўскага археалагічнага таварыства – матэрыялаў для складання археалагічных карт. У пачатку ХХ ст. Гродзенскім і Магілёўскім губернскімі статкамітэтамі збіраліся матэрыялы аб помніках даўніны ў губернях, звесткі аб помніках Айчыннай вайны 1812 г. для Найвышэйша зацверджанай камісіі па апісанні баявых трафеяў рускага войска і старых рускіх сцягоў.

Збор мясцовай інфармацыі здзяйсняўся рознымі шляхамі. Статыстычныя звесткі паступалі з паліцэйскіх упраў і іншых мясцовых органаў, ад упаўнаважаных асоб, у час выканання разнастайных запытаў ад уладных структур і арганізацый.

Гісторыкі часам ставяць пад сумненне дакладнасць некаторых звестак, сабраных губернскімі статкамітэтамі, асабліва ў параўнанні з матэрыяламі земскай статыстыкі. Але большасць даных губернскіх статкамітэтаў, напрыклад звесткі адрас-календароў, можна лічыць аўтарытэтнымі, да таго ж у гістарычных даследаваннях даныя з любых крыніц атрымліваюць праверку шляхам параўнання з іншымі фактаграфічнымі матэрыяламі і вынікамі іх крытычнага аналізу.

Матэрыялы, назапашаныя ў выніку збору і апрацоўкі статыстычных, даведачных, а нярэдка і гістарычных звестак, атрымлівалі адлюстраванне ў асобных выданнях і публікацыях губернскіх статкамітэтаў: «Аглядах губерняў» (дадаваліся да штогадовай Усёпадданейшай справаздачы губернатара), «Памятных кніжках…», тэматычных даведніках, на старонках «Губернскіх ведамасцей», «Епархіяльных ведамасцей» і інш. Гэта дазваляла адлюстраваць шырыню кірункаў дзейнасці губернскіх статкамітэтаў і іх грамадскую значнасць, адказваць на павелічэнне попыту ў рэгіянальнай інфармацыі. Трэба сказаць, што губернскія статкамітэты яшчэ ў першыя дзесяцігоддзі існавання распачалі выпуск асобных выданняў, але па-сапраўднаму разгарнулі выдавецкую дзейнасць толькі ў другой палове XIX ст., калі вызначыліся доўгатэрміновыя праекты, усталяваліся тыпалагіч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя рысы асобных выданняў, быў назапашаны вялікі метадычны вопыт іх падрыхтоўкі.

Сярод друкаваных выданняў, якія рыхтаваліся губернскімі статкамітэтамі, аднымі з найбольш каштоўных з'яўляюцца ўніверсальныя даведнікі тыпу Памятных кніжак губерняў. Яны выходзілі ў 89 губернях і абласцях Расійскай Імперыі больш за 60 гадоў – з сярэдзіны XIX ст. да 1917 г. Падобныя даведачныя выданні («Памятныя кніжкі» – тыповая назва) былі распаўсюджаны ў XIX ст. у розных ведамствах, але значэнне важнейшых крыніц вывучэння гістарычнага мінулага набылі менавіта даведнікі губернскіх статкамітэтаў.

Структура гэтых даведнікаў вызначаецца пэўнай уніфікаванасцю. У найбольш поўным складзе яны змяшчалі адрас-каляндар, адміністрацыйны даведнік, статыстычны агляд губерні і навукова-краязнаўчы раздзел [1]. Адрас-каляндар, адміністрацыйны даведнік і статыстычны агляд адлюстроўвалі ў храналагічнай паслядоўнасці велізарныя пласты фактычных звестак аб губерні. Адрас-каляндар змяшчаў даныя аб усіх губернскіх і павятовых урадавых і грамадскіх установах з пералікам кадравага складу і дазваляў высветліць прынятае найменне і месцазнаходжанне арганізацыі, персаніфікаваць пэўных асоб.

Адміністрацыйны даведнік уключаў звесткі аб падзеле губерняў, паштовых і тэлеграфных установах, шляхах зносін, прамысловых і гандлёвых прадпрыемствах, бальніцах і аптэках, вучэбных установах, музеях і бібліятэках, кнігарнях і друкарнях, перыядычных выданнях, якія выпускаліся і выпісваліся ў губернях, пералік населеных пунктаў, спіы буйных землеўладальнікаў і інш.

У статыстычны агляд уваходзілі табліцы з паказчыкамі аб насельніцтве, землеўладаннях, сельскай гаспадарцы, дадзеныя па судовай, медыцынскай, фабрычна-заводскай статыстыцы, статыстыцы народнай асветы, пажараў, даходаў і інш.

Навукова-краязнаўчая частка прадстаўлена артыкуламі, аглядамі і іншымі матэрыяламі аб мінулым і сучаснасці рэгіёнаў. Змяшчаліся таксама археаграфічныя публікацыі і бібліяграфічныя матэрыялы.

У губернях на этнічна беларускіх землях Памятныя кніжкі выходзілі з сярэдзіны XIX ст. да 1916 г.: у Віцебскай – у 1861–1914 гг., Гродзенскай – у 1847–1915 гг., Магілёўскай – у 1853–1916 гг., Мінскай – у 1845–1916 гг. Выданне даведнікаў у Віленскай губерні пачалося ў 1845 г. і доўжылася да 1915 г. Часам па розных прычынах выпуск прыпыняўся, а праз некаторы час узнаўляўся. Адбываліся таксама і карэкціроўкі назваў.

Памятныя кніжкі Мінскага губернскага статыстычнага камітэта на 1889, 1892–1894 і 1900–1904 гг. выходзілі пад назвай «Памятная книжка и календарь Минской губернии», на 1869 і 1909–1917 гг. – «Памятная книжка Минской губернии и календарь». У Віцебскай губерні адпаведны даведнік на 1862 г. друкаваўся пад назвай «Памятная книжка Витебской губернии», на 90 г. – «Адрес-календарь Витебской губернии». У Магілёўскай губерні на 1876 г. – «Памятная книжка Могилевской губернии» – пад назвай «Адрес-

календарь Могилевской губернии на 1876 год», на 1905 г. – «Адрес-календарь и памятная книжка Могилевской губернии на 1905 год», на 1908 г. – «Памятная книжка и календарь Могилевской губернии на 1908 год». Найчасцей змяняліся назвы ў даведніку Гродзенскага губернскага статыстычнага камітэта: на 1858–1866, 1869, 1874 (ч. 1–2), 1875 (ч. 1), 1876 (ч. 1), 1877 (ч. 1), 1878 (ч. 1), 1890–1910 гг. была выдадзена «Памятная книжка Гродненской губернии», на 1867 г. – «Адрес-календарь служащих в Гродненской губернии лиц гражданского, военного и духовного ведомства», на 1879–1889 гг. – «Памятная книжка Гродненской губернии. Адрес-календарь и статистическо-справочные сведения». Вар'іраваліся назвы і ў «Памятной книжке Виленской губернии» (напрыклад, «Памятная книжка Виленской губернии на 1878 год. Адрес-календарь и статистическо-справочные сведения» і інш.).

На своечасовасць выхаду і склад выданняў уплывалі розныя фактары, у тым ліку аператыўнасць і дакладнасць інфармацыі, якая паступала, фінансавыя магчымасці. Так, у прадмове да «Памятной книжки Минской губернии на 1878 год» складальнікі адзначалі, што затрымка выдання выклікана спазненнем паступлення даных, неабходнасцю выпраўлення дапушчаных недахопаў: «Многие лица, которые приглашаемы были сообщить сведения, вполне в их руках находящиеся, но и они или совсем не отвечали, или же доставили нам тоже недавно. …Некоторые составлены неверно и потребовали исправления и разъяснения» (с. IX).

Маючы агульнае прызначэнне і пэўнае структурнае падабенства, Памятныя кніжкі асобных губерняў характарызуюцца індывідуальнымі асаблівасцямі ў розныя гады выдання. У першыя гады існавання яны прыметна адрозніваліся паміж сабой. Напрыклад, «Памятная книжка Витебской губернии на 1867 год», падрыхтаваная А.М. Семянтоўскім, змяшчае вялікі аб'ём гістарычна-краязнаўчых прац («Исторические судьбы Витебской губернии с конца XII до начала XVI века» прафесара П.Л. Дружылоўскага, «Памятники старины Витебской губернии» А.М. Семянтоўскага і інш.). Першыя Памятныя кніжкі Магілёўскай і Мінскай губерняў мелі больш выражаны даведачны характар. У Памятнай кніжцы Віленскага генерал-губернатарства на 1868 год вялікі гістарычны і этнаграфічны матэрыял па Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай і Ковенскай губернях спалучаецца з артыкуламі і данымі па статыстыцы***. Цікава, што гэта кніжка была складзена па рашэнні Віцебскага губернскага статкамітэта, рэдагавалася А.М. Семянтоўскім, а выйшла ў Санкт-Пецярбургу. Але найбольш аднатыпнымі (амаль уніфікаванымі) па структуры Памятныя кніжкі сталі ў апошняй чвэрці XIX – пачатку XX ст.

Нягледзячы на пэўныя адметнасці, асноўную структуру большасці Памятных кніжак беларускіх губерняў утваралі наступныя групы матэрыялаў: каляндарныя звесткі і звесткі аб Расійскім Імператарскім Доме і вышэйшых дзяржаўных установах; адрас-календары (ці асабовы склад урадавых і грамадскіх установ у губернях); даведачныя, адміністрацыйныя і статыстычныя звесткі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спачатку змяшчаліся табель-календары, рэлігійныя календары: праваслаўны, рымска-каталіцкі, пратэстанцка-лютэранскі, яўрэйскі, магаметанскі (мусульманскі), што адпавядала этнічнай і канфесійнай структуры насельніцтва беларускіх губерняў; звесткі аб складзе Расійскага Імператарскага Дому, вышэйшых органах улады ў Расійскай Імперыі, губернатарах, віцэ-губернатарах. У некаторых даведніках асобна падаваліся даныя аб найбольш значных памятных і юбілейных падзеях у губерні («Хронологические указания главнейших событий края» ў «Памятных кніжках Магілёўскай губерні») і некаторыя іншыя матэрыялы.

Адрас-календары (іншыя назвы такога роду матэрыялаў: «Губернские учреждения», «Состав чинов и лиц гражданского, военного и духовного ведомств… губернии», «Личный состав правительственных и общественных учреждений… губернии» і інш.) змяшчалі вялікі аб'ём звестак аб губернскіх і павятовых установах, сістэме органаў дзяржаўнай улады, кіравання і самакіравання, аб канфесійных і прыватных установах, іх персанальным кадравым складзе і месцы знаходжання. Пералік губернскіх устаноў часта падаваўся па ведамствах (Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства фінансаў, Міністэрства юстыцыі, Міністэрства гандлю і прамысловасці, Міністэрства народнай асветы і інш.), а гарадскія і павятовыя ўстановы прыводзіліся пад назвамі адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Храналагічная паслядоўнасць у выпуску Памятных кніжак дапамагала па матэрыялах адрас-календароў прасачыць змяненні органаў упраўлення на тэрыторыі губерняў, узнікненне новых устаноў і арганізацый, іх тэрытарыяльнае размяшчэнне, змены ў штатным раскладзе, персанальным кадравым саставе. Аб кожным чыноўніку ці іншай асобе, унесенай у адрас-календары, як правіла, паведамляліся наступныя звесткі: пасада і чын, узнагароды і іншыя адзнакі, час знаходжання на службе і год уступлення на пасаду, навучальныя ўстановы, якія былі закончаны (ці навучанне не завершана), сямейнае становішча (жанаты, халасты, удовы), веравызнанне (для неправаслаўных). Хуткі пошук асоб, унесеных у адрас-календары, здзяйсняўся з дапамогай алфавітных паказальнікаў імён.

Даведачныя, адміністрацыйныя і статыстычныя звесткі ахоплівалі самыя разнастайныя матэрыялы, якія групаваліся, як правіла, у два раздзелы: даведачныя і адміністрацыйныя звесткі (у Памятных кніжках Мінскай губерні) ці даведачна-статыстычныя звесткі (у Памятных кніжках Магілёўскай губерні). У іх складзе стабільна прадстаўлены агляды насельніцтва губерні, геаграфічна-статыстычныя апісанні тэрыторыі, звесткі аб тэрыторыі судова-міравых участкаў, матэрыялы аб валасных праўленнях, фактаграфічная інфармацыя аб станах, лясніцтвах, прызыўных участках, функцыянаванні пошты, розных відах грамадскага транспарту, кірмашах, гарадах губерні, цэрквах усіх канфесій, манетах, мерах і вагах, звесткі аб урачах, фельчарах і ветэрынарах, натарыусах, асобах пракурорскага нагляду, судовых следчых, купцах, а таксама палажэнні, правілы, настаўленні, інструкцыі і іншыя афіцыйныя дакументы мясцовых улад.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Агляды натуральных і вытворчых сіл губерняў паказвалі дынаміку насельніцтва за папярэдні год ці за ранейшы храналагічны тэрмін. Колькасныя паказчыкі суправаджаліся змястоўным апісаннем і аналізам складу жыхароў па шэрагу сацыяльна-дэмаграфічных і сацыяльна-эканамічных параметраў, у тым ліку канфесійнай і саслоўнай прыналежнасці і інш.

Геаграфічна-статыстычныя апісанні змяшчалі даныя аб размеркаванні зямель паміж Упраўленнем дзяржаўных маёмасцей, царкоўнымі ўстановамі, надзелах, адведзеных сялянам, а таксама землях, якія належалі прыватным асобам, землях, занятых пад дарогі. Падавалася падрабязная характарыстыка глеб і галін гаспадаркі (вырошчвання зерневых і іншых культур, рыбалоўства, жывёлагадоўлі, рамёсел і інш.), асвятляліся таксама пытанні народнай маральнасці і правапарушэнняў, выканання вайсковага прызыву.

Для шматлікіх спісаў, якія паказвалі структуру мясцовага кіравання і самакіравання, функцыянавання інфраструктурных службаў, былі характэрны наступныя рысы: падрабязнасць звестак, наяўнасць даных у таблічнай форме, паўната інфармацыі аб службовых асобах. Напрыклад, расклады пошты змяшчаюць указанні на дакладныя дні і часы прыёму, адпраўлення і атрымання паштовай карэспандэнцыі ў населеных пунктах. Аб службовых асобах давалася таксама дастаткова падрабязная інфармацыя: поўнае імя, пасада, а часам і месца пражывання.

На старонках Памятных кніжак публікаваліся афіцыйныя дакументы мясцовых улад, якія рэгламентавалі пытанні гаспадарчай і сацыяльна-культурнай дзейнасці насельніцтва. Напрыклад, матэрыялы, прысвечаныя выдачы прамысловых пасведчанняў і білетаў, проціпажарнай бяспецы, карыстанню вадой, утрыманню боень, прыбіранню тратуараў, захаванню дрэў на гарадскіх вуліцах і інш. Часта змяшчаліся матэрыялы аб стане акцызнай справы ў губернях.

Але нярэдка рэдактары ўносілі пэўныя змяненні ў паслядоўнасць раздзелаў, уключалі новыя матэрыялы, што надавала індывідуальнасць асобным выпускам. Так, у Памятных кніжках Віцебскай губерні, як адзначалася вышэй, публікавалася значная колькасць гістарычных матэрыялаў. Памятныя кніжкі Гродзенскай губерні спачатку складаліся з трох раздзелаў: гістарычнага, статыстычнага і адрас-календара, а затым структура змянілася і асноўнымі часткамі сталі каляндарныя звесткі, асабовы склад урадавых і грамадскіх устаноў, статыстычны агляд Гродзенскай губерні за папярэдні год і даведачныя звесткі. Памятныя кніжкі Магілёўскай губерні складаліся з календара, адрас-календара, даведачна-статыстычных звестак, змяшчаліся таксама гістарычныя артыкулы.

Хаця матэрыялы краязнаўчых даследаванняў – артыкулы, гістарычныя дакументы і іншыя – змяшчаліся ў Памятных кніжках эпізадычна, але з’яўляліся важкім укладам у вывучэнне гістарычнага мінулага і сучаснасці рэгіёнаў. Так, у складзе «Памятной книжки Виленской губернии на 1860 год» быў выдадзены «Историко-статистический сборник Виленской губернии…». У «Памятной книжке Виленского генерал-губернаторства на 1868 год» змешчаны артыкулы па этнаграфіі насельніцтва Пінскага, Навагрудскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паветаў, аб Барысаве і іншых мясцінах. У «Памятную книжку Минской губернии на 1891 год» увайшлі такія краязнаўчыя творы, як «Минский театр и его прошлое» і «Летопись города Минска» [2] і інш.

Памятныя кніжкі беларускіх губерняў як афіцыйныя даведнікі-штогоднікі ўваходзяць у лік найбольш каштоўных дакументальных крыніц XIX – пачатку XX ст. Яны былі вынікам дзейнасці мясцовых статыстычных органаў і акумулявалі шырокі спектр звестак аб развіцці рэгіёнаў Беларусі таго часу. Сёння гэтыя выданні арганічна ўключаюцца ў крыніцазнаўчую базу беларускай гістарычнай навукі і краязнаўства, спрыяюць інфармацыйнаму забеспячэнню гістарычных і гістарычна-краязнаўчых даследаванняў, гістарычнага адукацыйнага працэсу і задавальненню пазнавальных інтарэсаў аматараў айчыннай гісторыі.

ЛІТАРАТУРА

1. **Балацкая, Н. М.** Наследие регионов – достояние нации : программа РНБ «Памятные книжки губерний и областей Российской империи» / Н. М. Балацкая, А. И. Раздорский // Библиотека. – 1996. – № 5. – С. 13–15.

2. **Памятная** книжка Минской губернии на 1891 год. – Минск : Типолитография Б. И. Соломонова, 1890. – XXXIV, 240, 36, 95 с.

3. **Полное** собрание законов Российской империи : собрание 2-е : [в 55 т.]. – Санкт-Петербург : в Типографии II Отделения Собственной е. и. в. канцелярии, 1830–1884. – Т. 9, отделение 2 : 1834 : от № 7380–7716. – 1835. – [832] с. разд. паг.

4. **Полное** собрание законов Российской империи : собрание 2-е : [в 55 т.]. – Санкт-Петербург. – в Типографии II Отделения Собственной е. и. в. канцелярии, 1830–1884. – Т. 33, отделение 1 : 1858 : от № 32629–33350. – 1860. – 802 с.

*http://www.snor.ru/?an=about_gub.

**Гэта і астатнія прозвішчы сакратароў статкамітэтаў пададзены ў прама храналагічным парадку іх працы над «Памятнымі кніжкамі…».

***У другой палове XIX ст. ахоплівала Віленскую, Гродзенскую і Ковенскую губерні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ